

**Страта**

# БУТАКОЎ Аляксандр Іванавіч

На 88 годзе жыцця памёр выдатны тэатральны педагог, тэатразнаўца, кандыдат мастацтвазнаўства, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, прафесар БУТАКОЎ Аляксандр Іванавіч.

Нарадзіўся Аляксандр Іванавіч 06.09.1921 г. у сялянскай сям'і ў весцы Ніжняя Валшанка Лузскага раёна Кіраўскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны шматлікімі ордэнамі і медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Будучы лейтэнантам, у 1945 годзе паступіў у Беларускі дзяржаўны тэатральны інстытут на акцёрскае аддзяленне. Аляксандр Іванавіч меў студэнцкі білет № 1. Вучань знакамітых заснавальнікаў беларускай прафесійнай тэатральнай школы Е.А. Міровіча, К.М. Саннікава, Д.А. Арлова.

Атрыманыя веды ад карыфеяў беларускага тэатральнага мастацтва, ад сваіх Настаўнікаў, свой жыццёвы і творчы вопыт на працягу ўсяго свайго жыцця Аляксандр Іванавіч як таленавіты чалавек, педагог шчодра перадаваў сваім шматлікім вучням у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце і з 1997 года — у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, якія плённа працавалі і працуюць амаль ва ўсіх тэатрах нашай рэспублікі, а таксама ў розных сферах мастацтва і культуры Беларусі і за яе межамі.

Чалавечыя і педагагічныя якасці, яго шчырасць, дабрыня і сціпласць, высокае патрабаванне і адказнасць — заўсёды былі прыкладам для яго вучняў і сяброў, для блізкіх і родных людзей, для ўсіх, хто меў дачыненне да асобы Настаўніка, Творцы, Чалавека — Аляксандра Іванавіча Бутакова.

Памяць аб ім назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

**У.Рылатка, Р.Янкоўскі, А.Дудараў, Р.Смольскі, Б.Святлоў, В.Анісенка, В.Раеўскі, Б.Луцэнка, Э.Герасімовіч, І.Курган, У.Мішчанчук, Л.Манакова, Я.Громаў**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ